## Конец «Крывавага патопу»

Вайна скончылася 30 студзеня 1667, калі было падпісана Андрусаўскае замірэнне, паводле якога Смаленск назаўсёды адышоў ад беларускіх земляў да Расіі. Камісары Вялікага Княства, з аднаго боку, і расійскія царскія паслы, з другога, у вёсцы Андрусава, што паміж Смаленскам і Мсціславам, падпісалі дамову аб замірэнні тэрмінам на 13 з паловай гадоў.



**Беларускія рыцары-абаронцы**



**Стэфан Пац. Арганізатар гераічнай абароны Крычава ў 1654 годзе**

"Крававым патопам" вайну паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскім царствам назвалі нездарма. Тады загінуў кожны другі беларус. З 2,9 млн чалавек засталося толькі 1,4 млн. А у Полацкім, Віцебскім і Мсціслаўскім ваяводствах (у апошняе, дарэчы, уваходзіў і Крычаў) пустымі сталі 65-70% сялянскіх хатаў. Сотні тысяч беларусаў былі перасяленыя ў Расію. Пасля вайны ў Крычаве практычна не засталося жыхароў. Амаль усе жылыя пабудовы і храмы разбураны. Замак спалены ўшчэнт...
Аднак Крычаў, як тая птушка Фенікс—адрадзіўся з попелу. Ужо ў 1694 г. у Крычаве налічвалася 8 цэркваў, сінагога і касцёл. З 1682 г. дакладна вядома пра існаванне тут прыходскіх школ. Адбудаваны замак і ратуша. Насельніцтва ў гэты час складала каля 2000 чалавек!

Дзяржаўная ўстанова адукацыі " Сярэдняя школа №1 г. Крычава"



Сярэдняя школа № 1



Адрас: вул. Супрунова, 11, 213500
Крычаў, Магілёўская вобласць
Тэл.: +375 (2241) 52-151
Эл. пошта:

© Навукова-выдавецкі цэнтр пры ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Крычава"

Сярэдняя школа № 1



# НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА І КРЫЧАЎ



**Народ, які не ведае сваёй гісторыі—не будзе жыць добра!**

XVII ст.—самы драматычны перыяд у жыцці горада і ўсёй краіны

# Што ж было насамрэч?

Лічыцца, што самай жудаснай вайной, што закранула Беларусь была Другая сусветная. Але гэта не так.



**Беларускія рыцары-абаронцы**

Нажаль, была яшчэ адна значна больш трагічная і, адначасова, гераічная старонка ў гісторыі Радзімы. Гэта так званы "Крывавы патоп" - вайна з Маскоўскім царствам 1654-67 гадоў. Асабліва моцна яна закранула ўсход краіны, у тым ліку і Крычаў...

Яшчэ не паспелі адгрымець ліхія падзеі пачатку XVII ст., калі крычаўцы пакрылі сябе вечнай славай, самааддана абараняючы родны горад ад "гасцей" з усходу. Яшчэ не сцішылася радасць ваенных перамог. Яшчэ востра адчувалі маці, жонкі і сёстры гонар за сваіх мужчын. Яшчэ кожны памятаў, як за мужнасць і гераізм кароль і вялікі князь Уладзіслаў дараваў Крычаву права на самакіраванне і герб...



**Адбітак пячаткі Крычаўскага магістрата з гарадскім гербам**

Усе жахі, голад і смерць ззаду—можна спакойна жыць на роднай зямлі.

Аднак пачалася чарговая вайна і крычаўцам зноў давялося бараніць ваколіцы горада. З 30 ліпеня 1654 года пачалася гераічная абарона горада ад маскавітаў. Усё мужчынскае насельніцтва было падзелена на дзесяткі, з якіх складаліся сотні. Ваяводы Шарамецеў і Шчарбатаў узялі Крычаў у аблогу, але вынікаў гэта ніякіх не давала. Не дапамагла нават дапамога прысланая з-пад Дуброўны. Маскоўскія войскі, значную частку якіх складалі татары, не маглі захапіць горад. Мала таго, абаронцы пастаянна здзяйснялі ўдалыя начныя вылазкі. І Смаленск, і Орша, і Мсціслаў, і Горы, і Магілёў, і Дуброўна ўжо даўно былі захоплены маскавітамі, а Крычаў упарта не скараўся ворагам. І толькі пасля таго, як у канцы верасня сярод





абаронцаў пачаўся голад, яны склалі зброю. Тым больш, што дапамогі чакаць было неадкуль...



**Маскоўскія вершнікі XVII ст.**

У замку размясціўся казацкі атрад, які бесперапынна займаўся рабаваннямі мясцовага насельніцтва. У 1658 г. мяшчане паднялі паўстанне і знішчылі маскоўскі акупацыйны гарнізон. Пасля гэтага ў 1659 г. горад зноў захоплены рускімі, а ў замку размяс-ціўся чарговы атрад акупантаў. Аднак крычаўцы не скарыліся. У 1660 г. мяшчане яшчэ раз вызвалілі Крычаў, але ўсяго на некалькі месяцаў, – у лістападзе яго занялі аддзелы казацкага палкоўніка Раслаўчанкі. Аднак ужо ў сакавіку 1661 г. горад канчаткова здабыў свабоду!

Сярэдняя школа № 1

**Крычаў**